Не ты выбіраеш Бога – Ён выбірае цябе

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
17.05.2015 01:00



Сёння сваю гісторыю распавядае ксёндз Пётр Вішнеўскі з Кангрэгацыі святога Арханёла Міхала. Быў уважлівы на малітве

Ксёндз Пётр паходзіць з сям'і католікаў. Нарадзіўся ў польскім горадзе Брадніца – краіне ста азёр. Бацькі выхоўвалі чацвёра дзяцей: акрамя Пятра, яшчэ двух хлопчыкаў і дзяўчынку.

Дзеці раслі ў набожнай сям'і. Кожнае свята наведвалі разам з бацькамі касцёл.

“Памятаю такі цікавы момант, – успамінае ксёндз Пётр. – **Мама маленькім брала мяне ў касцёл. Перад св. Імшой я таксама пайшоў на Гадзінкі да Найсвяцейшай Панны Марыі. Я яшчэ тады нічога не разумеў і пытаўся ў мамы, калі ўжо будуць гадзінкі. Мне здавалася, што мы будзем маліцца цытуючы гэтую малітву (смяецца – заўв. аўт.). А Гадзінкі – гэта спяваная малітва”**

.

†

Замест семінарыі – на повара

Паступова ў хлопца паспявала жаданне служыць Богу. Але калі сын сказаў маці, што хоча стаць святаром, тая запярэчыла. Запэўніла, што ён сустрэне добрую дзяўчыну і ажэніцца з ёй.

Пасля 8 класа школы замест семінарыі хлопец пайшоў вучыцца на повара ў Гастранамічнае вучылішча ў Торуні. **“Там шмат дзяўчат было: у нашай групе 29, а хлопцаў усяго 3. Гэта быў важкі аргумент”.**

Хутка малады чалавек скончыў вучылішча. Жаданне быць святаром не знікла. Але маці сказала, што сын павінен уладкавацца на працу, папрацаваць па прафесіі і толькі пасля можа ісці ў семінарыю.

“Я атрымаў працу ў дзіцячым садку, але ўжо не ўладкоўваўся туды”.

Ва ўзросце 18 гадоў малады чалавек паступіў у Ніжэйшую духоўную семінарыю ў Пяставе.

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
17.05.2015 01:00

“Мама пакінула на акне ключык, калі я раптам захачу вярнуцца...”

У чаканні Божага бласлаўлення



А пайшоў хлопец далёка – за 700 кіламетраў ад дома ў ордэн міхалітаў. Уступіў там у навіцыят. Пасля быў год практыкі, калі ён працаваў як закрыстыянін. А затым паступіў у Вышэйшую духоўную семінарыю ў Кракаў.

“Сустрэў там некалькіх прафесараў, якія вучылі Яна Паўла II”.

Пасля семінарыі непрацяглы час працаваў у Польшчы. Але хутка выказаў жаданне паехаць у Беларусь.

“Напісаў заяву з просьбай. Разам са мной было яшчэ 5 ксяндзоў і 4 сястры. Але здарылася так, што мясцовыя ўлады зацвердзілі толькі маю заяву, а іншыя адхілілі”.

У Беларусь ксёндз Пётр прыехаў як дыякан.

“Яшчэ 10 гадоў я чакаў святарскіх пасвячэнняў”.

Манах і святар

У 2005 годзе адбылася гэтая доўгачаканая падзея. 11 чэрвеня – ва ўспамін святога Барнабы – ксёндз біскуп Аляксандр Кашкевіч у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў Шылавічах удзяліў ксяндзу Пятру святарскія пасвячэнні.

“Я ўсё жыццё хацеў стаць святаром. Манахам і святаром. Гэтага не выбіраеш – адчуваеш сэрцам. Такія рэчы цяжка растлумачыць, можна толькі параўнаць з чымсьці. Святарскае пакліканне нечым падобна на заручыны, пазней – на шлюб. У Святым Пісанні сустракаем наступныя радкі: «Умілаваным заўсёды з’яўляецца Езус, умілаванай – чалавечая асоба»”.

Шчаслівы, ксёндз Пётр хутка адзначыць 10-годдзе свайго святарскага служэння.